*Юлія Канашэвіч*

# РЭСПУБЛІКАНСКАЕ СВЯТА-КОНКУРС ВАКАЛЬНА-ХАРАВЫХ КАЛЕКТЫВАЎ, ПРЫСВЕЧАНАЕ 1ОО-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Г.І. ЦІТОВІЧА ЯК ФЭСТ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

У кан. XX - пач. XXI ст. на Беларусі інтэнсіўна пачалі праводзіцца фестывалі міжнароднага, рэспубліканскага і абласнога ўзроўняў. Выявілася жанравая і рэгіянальная дыферэнцыяцыя фестывальных акцый. Найбольш значныя з іх «абслугоўваюць» амаль усе жанры народнай мастацкай творчасці. Яны адлюстроўваюць стан і тэндэнцыі развіцця жанру, садзейнічаюць эфектыўным навукова- метадычным кансультацыям і арганізацыйна-кіраўнічай падтрымцы калектываў і выканаўцаў.

Фестываль - масавае святочнае мерапрыемства, ў якім адбываецца паказ дасягненняў у пэўных відах мастацтва (вакальныя, харавыя спевы, музычнае мастацтва, кіно, тэатр і інш.). Фестываль працягваецца некалькі дзён і частка паказаў (прадстаўленняў) адбываецца на адкрытай прасторы ў асяроддзі архітэктурнага ансамбля горада ці прыроднага ландшафта.

Большасць фестываляў народнай творчасці ўзнікалі там, дзе склаліся трывалыя гістарычна - культурныя традыцыі і была сфарміравана пэўная сацыякультурная прастора. Умовай укаранення мастацкіх ідэй, закладзеных у аснову фестывальных акцый, у тым ці іншым месцы з'яўляецца іх прымальнасць і прывабнасць для большасці насельніцтва. Найбольшы сацыяльна-культурны эфект дасягаецца ў тых выпадках, калі адбываецца ўключэнне ў сучасныя кантэксты асабліва значных для соцыўма падзей, асоб, помнікаў мастацтва. Так, сярэднявечную гісторыю і культуру Беларусі рэканструюць такія вядомыя беларускія фестывалі як «Навагрудак», «Белая вежа», «Мірскі замак», «Заслаўскі набат», «Беларусь - мая песня» [1].

У межах Усебеларускага фестывалю «Беларусь - мая песня» праводзілася Рэспубліканскае свята-конкурс вакальна-харавых калектываў, прысвечанае 100-годдзю з дня нараджэння Г.І. Цітовіча. Свята складалася з некалькіх этапаў. У ім прымалі ўдзел непрафесійныя самадзейныя калектывы, аснову рэпертуара якіх складала спеўная беларуская народная лірыка. У свяце маглі прымаць удзел усе калектывы, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі. Менавіта таму, гэтае свята можна лічыць фестывалем.

Рэспубліканскае свята-конкурс вакальна-харавых калектываў, прысвечанае 100-годдзю з дня нараджэння Г.І. Цітовіча, праводзілася з мэтай паглыблення ўплыву нацыянальнай музычнай спадчыны на эстэтычнае выхаванне насельніцтва рэспублікі, развіцця вакальна-харавога мастацтва, пашырэння музычна-асветніцкай дзейнасці вакальна-харавых калектываў, павышэння іх мастацкага і выканаўчага майстэрства, правядзення святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння Г.І.Цітовіча. Рэпертуар удзельнікаў абавязкова павінен быў уключаць беларускую народную песню ў апрацоўцы Г.1. Цітовіча. Свята-конкурс праводзілася па трох намінацыях: хары з народнай манерай выканання; ансамблі народнай песні і танца; вакальныя ансамблі народнай песні. Конкурсныя выступленні творчых калектываў ацэньваліся па наступных крытэрыях: выканальніцкае майстэрства; сцэнічная культура і касцюміраванне; захаванне рэгіянальных традыцый і асаблівасцей народных песенных твораў; раскрыццё музычна-вобразнага зместу і рэжысура конкурснай праграмы; творчая арыгінальнасць і музычна-асветніцкая дзейнасць калектываў. Свята-конкурс праводзілася ў два этапы: першы этап - абласныя адборачныя туры свята-конкурсу з правядзеннем выніковых канцэртаў; другі этап - заключны гала-канцэрт свята-конкурсу ў Мінску, у якім прынялі ўдзел творчыя калектывы, якія сталі пераможцамі свята-конкурсу. Таксама ў гала-канцэрце прымаў удзел Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча. Удзельнікам свята-конкурсу былі ўручаны спецыяльныя трохступеньчатыя дыпломы, фашовыя прызы і памятныя падарункі.

Дыплом трэцяй ступені атрымалі: вакальна-харэаграфічны калектыў «Гомій», народны хор Лёзненскага раённага дома культуры, народны хор «Спадчына», народны хор Морацкага сельскага Дома культуры Клецкага раёна, народны хор "Палессе", народны ансамбль песні і музыкі «Крыніца», народны ансамбль народнай песні «Мілавіца», народны ансамбль народнай песні і музыкі «Дзівакі», народны ансамбль народнай песні "Вербіца».

Дыплом другой ступені атрымалі: ансамбль песні «Спадчына», народны ансамбль народнай песні «Світанак», ансамбль песні і танца «Палескія зоры», ансамбль песні і танца ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў», народны хор народнай песні «Радуйся», народны хор работнікаў культуры «Зараніца» аўтаклуба Лельчыцкага раёна.

Дыплом першай ступені: народны хор «Крыніца», народны ансамбль народнай песні «Жытніца», ансамбль песні і танца «Талака».

Дыпломы лаўрэатаў: заслужаны аматарскі калектыў «Бліскавіца», ансамбль песні і танца «Спадчына», ансамбль народнай песні і музыкі «Шчодрыца». Ганаровы дыплом атрымаў Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча.

Сярод прадстаўленых нумароў можна адзначыць гурт «Гомій» з горада Гомеля, кіраўнікі якога стварылі харэаграфічны нумар на аснове аўтэнтычнага матэрыялу - танца з зэдлікамі. Гэты танец апісаны ў рабоце Ю.М. Чурко [2]. Таксама танец з зэдлікамі быў прадстаўлены этнографамі ў Гомельскай вобласці. На этнаграфічным відэазапісе «Народныя танцы Беларусі» паказвалі двух бабуль, якія вельмі ўдала і лоўка прытанцоўвалі на зэдліку. Прапанаваны рэквізіт стаў новым штуршком да фантазіі харэографаў, якія абыгрывалі зэдлік у харэаграфічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кампазіцыі. Ён выступаў як месца сустрэчы пар, месца абдымкаў, а таксама месца, з якога дзяўчына штурхала хлопца, які ей чымсьці не дагадзіў.

Прапановы па ўдасканаленню свята-конкурса заключены ў некалькіх аспектах. Па-першае, фальклорнае свята ці фестываль патрабуе вольнай прасторы, бо гэты конкурс складана ўявіць без прыроднага асяроддзя. Па-другое, неабходна арганізатарам фестывалю больш увагі засяроджваць на арыгінальныя работы харэографаў, хормайстраў, рэжысёраў, якія працуюць з самадзейнымі фальклорнымі калектывамі.

**Спіс літаратуры:**


1. Снвурова, Л.ГІ. Фестиваль народного творчества как феномен современного художественного процесса / Л.П. Сивурова // Вести Института совремнных знаний. - 2010. - № 3. - С. 66-67.
2. Чурко, Ю.М. Белорусский хореографический фольклор / Ю.М. Чурко. - Минск : Вышэйшая школа, 1990. - С. 297.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ